Вольга Прымачэнка

# З табой я дома

Кніга пра тое, як кахаць адно аднаго і заставацца вернымі сабе

БОМБОРА
ИЗДАТЕЛЬСТВО
Москва

Вольга Прымачэнка

# З табой я дома

Кніга пра тое, як кахаць адно аднаго і заставацца вернымі сабе

БОМБОРА
ИЗДАТЕЛЬСТВО
Москва

УДК 159.92
ББК 88.52
П76

Фото *Владимира Шатрова*

**Прымачэнка, Вольга Віктараўна.**
П76 З табой я дома. Кніга пра тое, як кахаць адно аднаго і заставацца вернымі сабе / Вольга Прымачэнка ; [перевод с русского Т. Ракицкой]. — Москва : Эксмо, 2025. — 416 с. — (Книги-бестселлеры на белорусском языке).

ISBN 978-5-04-216302-9

«З табой я дома», — гаворым мы камусьці асабліваму.

Таму, з кім не прыходзіцца таіцца, замятаць сляды, прыкідвацца і абараняцца, а можна проста быць сабой. І будаваць беражлівыя адносіны, поўныя даверу, сумленнасці і клопату.

У сваёй новай кнізе Вольга Прымачэнка, аўтар бестселера «Пяшчотна да сябе», гаворыць пра тое, як кахаць і заставацца вернымі сабе — саграваць адно аднаго цяплом, не згараючы дашчэнту.

Гэта кніга абніме самотных, суцешыць тых, хто расстаўся, і дапаможа разабрацца тым, хто заблытаўся ў сваіх пачуццях. А ўсім, хто закаханы і шчаслівы, яшчэ раз нагадае пра тое, як гэта важна — разам ствараць дом, пра які заўсёды марылі.

**УДК 159.92**
**ББК 88.52**

**© Примаченко О.В., текст, 2022**
**© Ракицкая Т., перевод на белорусский язык, 2025**
**© Оформление. ООО «Издательство «Эксмо», 2025**

**ISBN 978-5-04-216302-9**

*Дзецям: Назару і Веры.*
*Для нас з татам вы заўсёды будзеце пра каханне*

# змест


А хто не палае, калі гаворыць пра каханне... 9

На парозе кахання 25

Колькі хочаш шукаць, столькі можна 27

У пошуках «свайго» 37

Пра каханне «назаўсёды» 47

Неўзаемнасць 55

У пагоні за Няўлоўным Джо 67

Адзінота — не прысуд 75

Скачок у невядомасць 83

Разам 89

Пра «ідэальныя» адносіны 91

Пакахаеш, калі расплюшчыш вочы 101

Пра давер, ненападзенне і правілы 115

Добрае слова не бывае лішнім 125

Ролі ў сям'і 135

Межы ў адносінах 147

Ад кахання да залежнасці 161

## Мы спатыкнуліся, але не разбіліся 175

Цяжкасці ў адносінах 177

Сварак баяцца —
у каханне не хадзіць 189

«Не злуй мяне» і іншыя «непрыгожыя» пачуцці 209

Партнёр не хоча расці 219

А пагаварыць? 229

Рэўнасць 241

Здрады 251

Пра гатоўнасць быць бацькамі 269

Першы год пасля нараджэння дзіцяці 279

Калі стаць бацькамі не атрымліваецца 295

## Калі за каханнем зачыняюцца дзверы 301

Як зразумець, што гэта канец? 303

Як пражыць расстанне беражліва да сябе 321

Пра развод 333

Былыя. У кахання няма прошлага часу? 345

Пункт абнулення 353

Практыка 361

У чаканні кахання 366

1. Як прыгожа! 366

2. У што я веру (але больш не хачу) 367

3. Чаго я чакаю ад адносін 371

Рэсурс адносін 377

1. На падхваце 377

2. Мой партнёр — круты! 378

3. Трыццаць тры пытанні (матрыца вырашэння праблем у адносінах) 382

Дары расстання 386

1. «Я па-ранейшаму магу…» 386

2. Рэвізія рэсурсаў 388

3. Пошук залатой сярэдзіны 392

4. «Дзякуй табе. І мне» 396

Падзякі 401

Кнігі 406

Пра аўтара 413



а хто
не палае,
калі гаворыць
пра каханне...

незакаханаму жыць нашмат прасцей,
чым таму, хто кахае:

глядзіць адкрыта, не патанае
ў маркотных спевах,
не знаходзіць у іх сябе;

у клубок скруціўшыся,
не просіць жаласна і бяссільна:
«пакахай мяне, пакахай»;

незакаханы лёгкі, гуллівы, вясёлы, прывабны;
незакаханы жартуе, спявае, паводзіць сябе нахабна,

у меру спіць і есць, лічыць свабоду
дарам, вышэйшым за ўсё.

незакаханы ідзе да нялюбага з белым сцягам.
так і жыве: браніраваны, куленепрабівальны;

незакаханы непаражальны і недасягальны,
пакуль не сустрэне
бліжэйшае моцнае пачуццё.

*Ксенія Жалудова*

Калі мне было крыху больш за дваццаць і я толькі-толькі выйшла замуж (першы раз), мне ў рукі трапіла кніга, якая перавярнула мае ўяўленні пра каханне. Дзіўна, але гэта быў не падручнік па сямейнай псіхалогіі і не мемуары, у якіх аўтар раскрывае сакрэты доўгага шчаслівага шлюбу. Гэта быў раман пра кар'еру, які ўслаўляў амбіцыйнасць, моцнае творчае эга і асабістую адказнасць, — «Крыніца» амерыканскай пісьменніцы і філосафа Айн Рэнд.

Менавіта там я сустрэла словы, якія мне моцна запомніліся: «Каб сказаць: "Я цябе кахаю", — трэба навучыцца вымаўляць "я"»*.

Мне спатрэбілася шмат гадоў, каб зразумець *навошта*.

Калі ты юны, аб каханні ты маеш уяўленне ў асноўным з урокаў літаратуры, песень тыпу «адзінокі голуб на карнізе за акном» і музычных кліпаў. Медыякультура падае нам каханне як вечныя пакуты ў прыгожай абгортцы з эфектам

* Рэнд А. Источник / перевод с английского Д. В. Костыгина. — М.: Альпина Паблишер, 2011.

драмы. Не маючы альтэрнатывы, засвойваеш менавіта гэта: каханне — не пра ціхую радасць, а пра «жарсна сварыцца, расставацца і вяртацца», і чым ярчэйшыя ў адносінах эмоцыі, тым больш яно «шчырае». І мы настолькі захапляемся сілай пачуццяў, напружаннем парываў, эфектнымі жэстамі, што губляем з поля зроку *саміх сябе* — са сваімі межамі, каштоўнасцямі і глыбіннымі патрэбнасцямі.

Аддаючы занадта шмат увагі паказному глянцу і эмацыянальнай мішуры, мы рэдка задаём сабе важнае пытанне: *«Што гэтае каханне са мной робіць?»* Якім чалавекам я станаўлюся ў гэтых стасунках? Што адбываецца з маімі марамі, жаданнямі і мэтамі? Якія задачы і выклікі паўстаюць перада мной — і як я на іх адказваю?..

І толькі з узростам і досведам пачынаем нешта разумець пра каханне. Напрыклад, тое, што ў «мы» з'яўляецца каштоўным *кожнае* «я». *Кожны* з нас — палова любых адносін, не чацвярцінка, не акрайчык.

*Мы ўваходзім у каханне з паўнавартасным правам ствараць яго нароўне з партнёрам, далучаць да яго сваё бачанне «правільнасці» і прыгажосці, жывіць яго сваёй сілай.*

Нездарма другі загаловак гэтай кнігі: «Як кахаць адно аднаго і *заставацца вернымі сабе*». Калі беззваротна згубіцца ў «мы», здрадзіўшы сабе і сваёй непадобнасці, то можна атрымаць усё што хочаш, акрамя кахання: ад эмацыянальнай залежнасці да поўнай страты сябе ў іншым.